*Святлана Вяргеенка*

# ВОБРАЗ НАЧНІЦ У БЕЛАРУСКІХ ЛЕКАВЫХ ЗАМОВАХ: ІПАСТАСІ, ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ

Замовы «Ад начніц» складаюць асобную падгрупу беларускіх лекавых замоў і з'яўляюцца найбольш папулярнымі сярод замоўных тэкстаў ад дзіцячых хвароб. Значная колькасць фактычнага матэрыялу, як апублікаванага [2–6], так і архіўнага (архіва кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны») дазволіла правесці аналіз і апісаць міфалагічны персанаж начніц, улічваючы схему, прапанаваную расійскімі даследчыцамі Л. М. Вінаградавай і С. М. Талстой [1].

***1. Назвы, імёны. Інтэрпрэтацыі.***

Як адзначала С. М. Талстая, «начніцы – у славян начныя дэманы. Нападаюць галоўным чынам на дзяцей (часам толькі нованароджаных, да хрышчэння) і не даюць ім спаць (пар. таксама крыксы, плачкі, бабіцы, моры, вешчіцы і інш.). Начніцы – нявызначанага выгляду істоты, нябачныя ці падобныя да птушак, кажаноў, чарвякоў; прывіды, блукаючыя агні; радзей – жанчыны з даўгімі валасамі ў чорнай адзежы» [7]. У беларускіх лекавых замовах пры абазначэнні духа ночы, што не дае маленькім дзецям спаць, у асноўным выкарыстоўваюцца тэрміны ў форме назоўніка (у тым ліку і здвоенага) множнага ліку *начніцы (начнічкі)* (Мазырскі, Рагачоўскі п., Буда-Кашалёўскі, Брагінскі, Бярозаўскі, Ельскі, Жлобінскі, Калінкавіцкі, Лельчыцкі, Лоеўскі, Мядзельскі, Петрыкаўскі, Пінскі (Старадарожскі раён), Рэчыцкі, Хойніцкі раёны), *крыксы* (*крыксы і плаксы*) (Аршанскі, Віцебскі, Мазырскі п., Акцябрскі, Веткаўскі, Ельскі, Зэльвенскі, Кармянскі, Кіраўскі, Лельчыцкі, Петрыкаўскі, Пінскі, Хоцімскі раёны), *крыкоты* (Петрыкаўскі раён), *начнікі* (Асіповіцкі, Старадарожскі раёны), *водначы* (Акцябрскі раён), *крыксы-начніцы* (Гарадоцкі, Калінкавіцкі раёны), *крыксы-плаксы* (Кармянскі раён), *крыксы-вярыксы/вярэксы* (Буда-Кашалёўскі, Лельчыцкі раёны), *крыксы-крыксавіцы, плаксы-плаксавіцы* (Лельчыцкі раён), *начніцы-сястрыцы* (Хойніцкі раён); назоўніка жаночага роду адзіночнага ліку *нуда* (Петрыкаўскі раён), *крыксівіца, плаксівіца, несанота, недрамота* (Лельчыцкі раён), *вотнач* (Акцябрскі раён), *начніца* (Бельскі, Светлагорскі раёны), *крыклівіца-начлівіца* (Клецкі раён); назоўніка мужчынскага роду адзіночнага ліку *нашнік* (Старадарожскі раён); назоўніка (у тым ліку здвоенага) ніякага роду адзіночнага ліку *начышча* (Светлагорскі раён), *начнічышчэ-плаксівішчэ* (Веткаўскі, Лельчыцкі раёны), *начлівішча, крыклівішча, сухацішча* (Ганцівіцкі раён), *начнічышча* (Жыткавіцкі, Старадарожскі раёны), *шашнічышча* (Старадарожскі раён).

Эпітэты, якія выкарыстоўваюцца з названымі найменнямі, часцей за ўсё характарызуюць міфалагічны персанаж або стан па *спосабах узнікнення* (прыдуманыя/надуманыя, урочлівыя/урочныя, прыглядныя, дзіўныя, падзіўныя, гляныя, глазныя, прыпадныя, прыгаворныя/нагавораныя,

намаўляныя, пытаныя, здрававаныя, пасмешныя/насмешныя, накідныя/падкідныя, насланыя, падстрэчныя, пужаныя, здрыганыя, уляканыя/злекавыя, пацешныя, пасмешныя, накалымныя, супорныя, сонныя, сціклівыя, дрыслівыя, крыклівыя; ветраныя, вадзяныя, малочныя), *месцах лакалізацыі* (хатнія, дваровыя), *часу ўзнікнення* (дзённыя, палудзенныя, вячэрнія, палувячэрнія, начныя, палуначныя, светавыя, заравыя, цёмныя, часавыя, мінутныя), *уздзеянні асоб* (у тым ліку рознай ступені роднасці ці сацыяльнага статусу) (бацькавы, мужычыя/мужчынскія, маткіны, жаночыя/жаночкія, дзявоцкія/дзявочыя, бабіны, дзедавы, цёткіны, дзядзькіны, рабяцкія, хлапяцкія/хлапоцкія/хлапечыя, (парабоцкія/парабоскія), *жывёл* (каціныя, сабачыя, свінячыя, курыныя); *эмацыянальным* (жалосныя, уцешныя, падсмешныя), *фізічным уздзеянні* (калючыя, балючыя) *ступені неабходнасці* (карысныя), *жыццяздольнасці* (жывыя, мёртвыя.)

У замове, запісанай у г. Калінкавічы, міфалагічная істота, якая ходзіць па начах і будзіць дзяцей, называецца «палуношніцай» і мае ўласнае імя – Анна Іванаўна.

«Начніца» інтэрпрэтуецца як «добры чалавеча» (Старадарожскі раён), як «начніца-сястрыца» (Мядзельскі, Пінскі раёны), «красная дзявіца» (Чэрвеньскі раён), «красна панна-дзявіца» (Петрыкаўскі раён). Гэты прыём (задобрыванне хваробы) часта выкарыстоўваецца ў лекавых замовах з мэтай улагодзіць істоту і хутчэй ад яе пазбавіцца. У замове, запісанай у в. Будзенічы Старадарожскага раёна, «нашнік» параўноўваецца з «жалезным («вечным» – в. Поўстка Глускага раёна) сашнікам» – вострай часткай сельскагаспадарчай прылады.

***2. Іпастасі.***

Формы праяўлення начніц разнастайныя. Яны выступаюць як *антрапаморфныя* істоты (дзявіцы (панны-дзявіцы, сястрыцы, сыны і дочкі лясной бабы), якія маюць сваіх дачок), зрэдку маюць уласнае імя (Анна Іванаўна). Часцей начніцы паўстаюць у невыразным абліччы і могуць знаходзіцца ва ўсіх частках цела. У замове, запісанай у в. Ператок Калінкавіцкага раёна, істота называецца «палуношнікам і шчакатуном» і адсылаецца яна «*з белага цела, з гарачай крыві, з сэрца, з усёй плоці, з ясных ачэй, з чорных брывей, з усяго чалавечага саставу, з кожнай жылачкі, з кожнай костачкі, з сямідзесяці сустаўчыкаў*» [4, *80*, № 273].

У некаторых выпадках тэрмін *начніцы* (*крыксы, крыкніцы, крыксы-нашніцы, крыксы-плаксы, плаксы, начнушкі, нашнічкі*) сінанімічны плачу дзіцяці і ў такім найменні абазначае *стан* (напрыклад, «*...забяры ў майго дзіцяці плач і начніцы*» (Шчучынскі, Ельскі, Маладзечанскі раёны) [3, *333*, № 1131], Акцябрскі, Бабруйскі, Гомельскі, Добрушскі, Ельскі, Лельчыцкі, Калінкавіцкі, Кармянскі, Светлагорскі раёны), а таксама можа меркавацца як *прадмет*, што некуды падкладваецца, аддаецца або адбіраецца, дорыцца (напрыклад, «*вазьмі ў маёй маладзёніхі крыксы, плаксы, занясі сваёй маладзёніхі, пуд галованьку пакладзі...*» [3, *340*, № 1168] або «*шлём ім дары: крыксы, плаксы і начніцы...*» [2, *56*, № 151] і інш. (Барысаўскі, Брагінскі, Дзятлаўскі, Жыткавіцкі, Калінкавіцкі, Клічаўскі, Лагойскі, Крупскі,

Нараўлянскі раёны), ці *расліна* (напрыклад, «*...там ім раскусціцца і ўкараніцца*») (Жыткавіцкі раён).

Такім чынам, у беларускіх лекавых замовах начніцы – гэта дзявіцы (панны-дзявіцы), якіх нараджае ноч і якія маюць сваіх дачок. Яны ходзяць па начах, «налягаюць» дзіцяці на душу, «нудзяць» галоўку і сэрца, не даючы яму спаць «ні ўдзень, ні ўночы», або будзяць яго, мучаюць дзіця, «знабяць, сушаць», не даюць спакою ні ноччу, ні «ў зорушку». Зрэдку маюць ўласнае імя – Анна Іванаўна. Начніцы (начніцы-зарніцы) – гэта таксама істоты, якія здольны забраць ад дзіцяці «крыклівіцы», дапамагчы, «нарадзіць яго сном, здароўем» (Петрыкаўскі раён). Плаксы і крыксы – гэта дванаццаць сыноў і дванаццаць дачок лясной бабы.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Виноградова, Л. Н.* К проблеме идентификации и сравнения персонажей славянской мифологии / Л. Н. Виноградова, С. М. Толстая // Славянский и балканский фольклор. Верования. Текст. Ритуал. М., 1994.
2. Замовы / уклад.: У. А. Васілевіч, Л. М. Салавей; уступ. арт.: Л. М. Салавей. Мінск, 2009.
3. Замовы / уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Г. А. Барташэвіч; рэдкал.: А. С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск, 1992.
4. «На моры-акіяне, на востраве Буяне…» (лекавыя замовы Гомельшчыны): фальклорна-этнаграфічны зборнік / С. А. Вяргеенка; пад рэд. В. С. Новак; М-ва адукацыі РБ, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. Гомель, 2009.
5. Полесские заговоры (в записях 1970-1990 гг.) / сост., подготовка текстов и коммент. Т. А. Агапкиной [и др.]. М., 2003.
6. Таямніцы замоўнага слова / уклад., сістэм. тэкстаў, уступны арт., каментарыі і рэдаг. І. Ф. Штэйнера, В. С. Новак. Гомель, 1997.
7. *Толстая, С. М.* Ночницы [Электронный ресурс] / С. М. Толстая. – Режим доступа: http://pagan.ru/slowar/n/nochnicy0.php – Дата доступа: 09.08.2011.